# БОЛЬШ, ЧЫМ ДВУХБАКОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Сельскагаспадарчая эліта Беларусі і Узбекістана абмеркавала перспектыўныя кірункі ўзаемадзеяння

**Пытанні двухбаковых гандлёвых стасункаў, супрацоўніцтва ў галінах раслінаводства, племянной жывёлагадоўлі і ветэрынарыі, аграрнай адукацыі былі абмеркаваны на тэматычнай секцыі.**

**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Анатоль ХАЦЬКО** вітаў гасцей па-ўзбекску, чым выклікаў шчырыя воплескі. Кіраўнік ведамства лічыць аграпрамысловыя комплексы важнымі галінамі эканомікі для абедзвюх краін, паколькі менавіта сельская гаспадарка адказвае за харчовую бяспеку краіны.

«Устойлівае развіццё вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, харчовая бяспека — асноўныя кірункі макраэканамічнай палітыкі, якія патрабуюць асаблівай увагі. Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі ў АПК апошнім часам няўхільна развіваецца», — з задавальненнем адзначыў Анатоль Хацько.

Тавараабарот сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання па выніках мінулага года ўзрос практычна на 60 % і дасягнуў 30 мільёнаў долараў. Наладжана цеснае супрацоўніцтва з Ташкенцкай вобласцю.

«Рэалізуецца праект па стварэнні ў гэтым рэгіёне цэнтра па племянной справе, распрацоўваецца канцэпцыя стварэння селекцыйна-генетычнага цэнтра, а таксама прадпрыемства па вытворчасці ветэрынарных прэпаратаў», — паведаміў міністр.

Па яго перакананні, адзін з асноўных складнікаў экспартнага патэнцыялу Беларусі ў сельскай гаспадарцы — высакаякасная малочная і мясная прадукцыя. У Беларусі ў апошняе дзесяцігоддзе цалкам перабсталяваны малочнатаварныя фермы і прадпрыемствы перапрацоўкі, укаранёныя сучасныя сістэмы кантролю якасці прадукцыі, нарошчаныя аб'ёмы вытворчасці, прадпрыемствы сертыфікуюцца на адпаведнасць патрабаванням стандарту «халяль».

### КАНСАЛІДАВАЦЬ НАМАГАННІ

«Супрацоўніцтва ў апошнія гады пачало набываць новае напаўненне, другое дыханне. Мы маем намер, канешне, працягваць гэтую ўстойлівую і неабходную тэндэнцыю. Узбекістан разглядае Беларусь у якасці аднаго з ключавых партнёраў у галіне развіцця сельскай гаспадаркі», — адзначыў падчас пасяджэння секцыі **старшыня камітэта Сената Олій Мажліса Узбекістана па пытаннях міжнародных адносін, знешнеэканамічных сувязяў, замежных інвестыцый і турызму Алішэр КУРМАНАЎ.**

Ён паведаміў, што ў апошнія два гады Узбекістан здолеў значна актывізаваць супрацоўніцтва ў рэгіёне. Таму трэба бачыць не толькі адну дзяржаву, але і ўсю Цэнтральную Азію. Любая ініцыятыва, пачатая ва Узбекістане, не будзе абмяжоўвацца яго граніцамі, а пойдзе значна далей. Да таго ж замежныя партнёры карыстаюцца шырокім колам прэферэнцый і льгот.

Узбекістан, як і Беларусь, адчувае змяненні клімату, а таму патрабуе стварэння новых высокаўраджайных, устойлівых да розных хвароб і засухі сартоў бульбы.

«На планеце Зямля найлепшая нацыя, якая ўмее гэта рабіць, — беларусы», — выказаў упэўненасць Алішэр Курманаў.

У сферы селекцыі паміж Беларуссю і Узбекістанам ужо наладжаныя першыя кантакты: у Ташкенцкай вобласці праводзяцца тэхналагічныя іспыты васьмі сартоў бульбы і дваццаці сартоў культур агародніны.

Разам з тым старшыня камітэта з жалем адзначыў, што на шляху «шчаслівага шлюбу» паміж Беларуссю і Узбекістанам ёсць і некаторыя перашкоды, у тым ліку гандлёвыя абмежаванні. Таму асаблівую важнасць набывае рэжым свабоднага гандлю і ўмацаванне міжрэгіянальнага супрацоўніцтва.

Асаблівую зацікаўленасць узбекскія партнёры адчуваюць у тым ліку ў стварэнні інтэнсіўных садоў, цяплічных гаспадарак, магутнасцяў па перапрацоўцы плодаагароднінной прадукцыі, сучасных жывёлагадоўчых комплексаў і комплексаў па перапрацоўцы мяса-малочнай прадукцыі, машынна-трактарных паркаў.

«Калі кансалідаваць намаганні, можна будзе дасягнуць вялікіх поспехаў», — перакананы Алішэр Курманаў.

### БАР'ЕРЫ ПЕРААДОЛЬНЫЯ

Па інфармацыі **намесніка міністра сельскай гаспадаркі Узбекістана Саідкамола ХАДЖАЕВА,** у сельскай гаспадарцы краіны выкарыстоўваецца больш за 20 мільёнаў гектараў зямель, плануецца дадаткова асвоіць 1100 гектараў — да чаго запрашаюць беларускіх партнёраў.

Тым больш што сыравіна, матэрыялы, запчасткі ці абсталяванне, якія не вырабляюцца ва Узбекістане, пры ўвозе на патрэбу землекарыстання вызваляюцца ад мытных плацяжоў.

«Нашы эканомікі не канкуруюць, а дапаўняюць адна адну. Разумеем, што розніца нацыянальных стандартаў на адну і тую ж прадукцыю — бар'ер на шляху да развіцця міжнароднага гандлю, таму зацікаўлены ў абмене данымі аб нацыянальных стандартах, тэхнічных рэгламентах і сумесных распрацоўках па бяспецы харчовай прадукцыі», — прапанаваў намеснік міністра.

Ён запрасіў таксама на выстаўку «Зроблена ва Узбекістане», каб пакаштаваць мясцовую прадукцыю. Вінаградарства — адзін з кірункаў сельскай гаспадаркі, што развіваецца ў гэтай краіне найбольш хутка. Саідкамол Хаджаеў прапанаваў і беларускаму боку запусціць сумесныя вінныя кластары ў цэнтральнаазіяцкай краіне.

### ПРАДУКТЫ ДА ЎЗБЕКСКАГА СТАЛА

Беларусь са сваім развітым аграрным сектарам традыцыйна экспартуе каля 60 % малочнай і больш за 40 % мясной, у тым ліку ва Узбекістан. Пра гэта журналістам паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Аляксей БАГДАНАЎ.**

У Ташкенце працуе крама беларускіх тавараў, і асартымент беларускіх прадуктаў харчавання плануецца штогод пашыраць і павялічыць даходную частку на 800—900 тысяч долараў. Наш тавараабарот увогуле год ад году расце, прычым экспарт і імпарт — збалансаваныя.

«Вялікі патэнцыял у развіцці нашых паставак ва Узбекістан. Прааналізавалі імпарт Узбекістана і бачым: па тых кірунках, дзе ў нас ёсць перавытворчасць, можам накіраваць дадатковыя аб'ёмы. Гэта сухія малочныя прадукты, натуральнамалочная прадукцыя, мяса, племянная жывёла», — праінфармаваў Аляксей Багданаў.

> Узбекістан, як і Беларусь, адчувае змяненні клімату, а таму патрабуе стварэння новых высокаўраджайных, устойлівых да розных хвароб і засухі сартоў бульбы.

Беларусь пачала пастаўкі ва Узбекістан жывых коней, летась паставілі 275 галоў племянной жывёлы для развіцця малочнай жывёлагадоўлі ва Узбекістане, за паўгода 2019-га — ужо каля сотні галоў. Летась пачаліся і пастаўкі беларускай насеннай бульбы ва Узбекістан.

Цяпер рэалізуецца сумесны праект па стварэнні малочнатаварнага комплексу на тысячу галоў буйной рагатай жывёлы з цэхам перапрацоўкі, які будзе цалкам укамплектаваны беларускімі абсталяваннем і жывёлай. Працэс вытворчасці таксама будзе наладжаны па беларускіх тэхналогіях.

### РУХ НАПЕРАД

Галоўная задача I Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана — вызначыць аб'ёмы, якія краіны могуць закласці ў двухбаковае супрацоўніцтва, высветліць кірункі, па якіх далей ужо больш глыбока абмяркоўваць пытанні. Такую думку падчас работы секцыі выказаў Анатоль Хацько.

Стасункі на секцыі паслужылі ўмацаванню далейшага двухбаковага супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана ў аграпрамысловым комплексе, а прапановы і ідэі ў далейшым пойдуць у дарожную карту адносін дзвюх краін.

**Варвара МАРОЗАВА, фота аўтара.**

нашай краіны ўдзельнікам форуму прэзентаваў **дырэктар Дэпартамента па турызме Мінспорту і турызму Беларусі Андрэй МОЛЧАН.**

Паводле яго слоў, турызм у нашай краіне ацэньваецца як адзін з ключавых пунктаў эканамічнага росту. Калі ацэньваць даныя, то доля сферы турызму ў валавым унутраным прадукце ў 2014 годзе складала 1,8 %, а ўжо ў 2016 годзе — 2,2 %. Уязны турыстычны паток расце штогод: калі ў 2016 годзе да нас прыехала 10,9 мільёна турыстаў, то ўжо ў 2018 годзе іх колькасць склала 11,5 мільёна чалавек.

Беспрэцэдэнтныя меры па ўвядзенні бязвізавага рэжыму на асобных тэрыторыях краіны — унікальны вопыт, якім беларускі бок гатовы падзяліцца. Менавіта ён паўплываў на рост патоку замежных турыстаў на 50 % апошнія паўтара года.

— Ён забяспечыў сур'ёзны рост эканомікі і сферы паслуг у гэтых рэгіёнах, — падкрэсліў спікер.

У якасці прыкладу ён прывёў звесткі: у Брэсце з'явіліся 567 новых аб'ектаў у сферы турызму, на 7 % выросла загрузка гасцініц, у Гродне — 298 новых аб'ектаў і рост загрузкі на 23 %. Андрэй Молчан адзначыў, што адкрыццё межаў уплывае на эканоміку рэгіёнаў: дзякуючы росту турыстычнай прывабнасці паляпшаецца і інвестыцыйны клімат краіны.

Актыўна развіваецца і такі кірунак, як аграэкатурызм. Пра яго асаблівасці расказала **старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» Валерыя КЛІЦУНОВА.** Калі ў пачатку развіцця гэтага кірунку — у 2002 годзе — у краіне налічвалася 34 аграсядзібы, то сёння іх колькасць набліжаецца да 2,5 тысячы. Больш за 400 тысяч чалавек былі занятыя ў гэтай сферы па выніках мінулага года.

— Надышла эпоха эканомікі ўражанняў, якія будуць самыя запатрабаваныя, — перакананая яна.

Сёння ў краіне існуе надзвычай прывабная заканадаўчая база: заяўны прынцып рэгістрацыі, нізкія падаткі (прыблізна 12 долараў штогод), шырокі спектр паслуг, магчымасць будаўніцтва гасцявых дамкоў і іншыя прывабныя фактары.

У сваю чаргу **часовы выканаўца абавязкаў старшыні Дзяржкамітэта Узбекістана па турызме Абулазіз АКУЛАЎ** прывёў статыстыку: у краіне налічваецца больш за сем тысяч аб'ектаў культурнай спадчыны. Бязвізавы рэжым устаноўлены з 65 краінамі, што, безумоўна, дае свой эканамічны эфект: экспарт турыстычных паслуг па выніках 2018 года склаў больш за мільярд долараў.

Як бачым, пунктаў судакранання ў бакоў дастаткова шмат, у розных сферах і па розных кірунках, каб цяперашнія 157 мільёнаў долараў узаемнага тавараабароту павялічыць да мільярда.

**Вольга АНУФРЫЕВА. Фота Канстанціна ДРОБАВА.**